7. Внешняя торговля Республики Беларусь : стат. сб. / Национальный статистический комитет Республики Беларусь. — Минск, 2017. — 389 с.

8. Внешняя торговля Республики Беларусь : стат. сб. / Национальный статистический комитет Республики Беларусь. — Минск, 2018. — 373 с.

9. Внешняя торговля Республики Беларусь : стат. сб. / Национальный статистический комитет Республики Беларусь. — Минск, 2022. — 29 с.

10. Белорусско-российское сотрудничество // Посольство Республики Беларусь в Российской Федерации. — URL: https://russia.mfa.gov.by/ru/bilateral_relations/cooperation/ (дата обращения: 04.04.2025).

***Л.Р. Кулікоўская***
*Навуковы кіраўнік — І.І. Сацукевіч*
*БДЭУ (Мінск)*

# ПЯРШАЙСКАЯ ТРАГЕДЫЯ 15–19 ЛІПЕНЯ 1943 Г.

Генацыд беларускага народа — адна з самых жудасных падзей, якая перапала на долю нашага народа падчас Вялікай Айчынай вайны. Масавыя забойствы мірнага насельніцтва, гвалтоўны вываз грамадзян за мяжу для прымусовай працы. Гісторыя не ведае ніводнага падобнага факту, калі генацыд ажыццяўляўся ў такіх маштабах і з такой жорсткасцю. Актуальнасць гэтай тэмы ў сучасным свеце абумоўлена не толькі яе гістарычным значэннем, але і неабходнасцю папярэджання падобных трагедый у будучыні.

Мэта работы: выявіць абставіны трагічнай падзеі, якая адбылася ў мястэчку Пяршаі 15–19 ліпеня 1943 г.

Задачы:

- вывучыць, як выглядала мястэчка Пяршаі і касцёл у 1930-я гг.;
- вызначыць дзейнасць партызан ў Налібоцкай пушчы;
- даследаваць, што адбылося з ксяндзамі і людзьмі 15–19 ліпеня 1943 г.;
- выявіць, як захоўваецца гістарычная памяць пра падзеі 1943 г.

У 1930-я гг. пачалося будаўніцтва новага касцёла ў Пяршаях. З успамінаў жыхара вёскі Янушкавічы, Поклада Антона: парафіяне вырашылі ўносіць грошы на будоўлю касцёла ад колькасці гектараў зямлі. Акрамя грошай, кожны дарослы чалавек павінен быў некалькі дзён адпрацаваць дарма на будоўлі касцёла. Праца была цяжкая, пілавалі лес уручную, вазілі коньмі, цэглу выраблялі ў Жыдовічавым лесе, каля вёскі Даўгулёўшчына, апальваць вазілі ў Іслачоўку, дзе была графская цагельня. Пустакі выраблялі з пяску і вапны ў асобных формах і сушылі. У выніку сумеснай працы касцёл быў пабудаваны ў 1935 г. 8 верасня 1936 г. адбылося асвячэнне новапабудаванага касцёла біскупам К. Букрабам. Службу вёў ксёндз Ісідор Петраш, асвечаны біскупам Казімірам Букрабам.

У кастрычніку 1939 г. у Пяршайскую парафію быў накіраваны айцец Ахілес, як пробашч, а ў 1941 г. з Вільні прыехаў айцец Герман, ён стаў працаваць вікарыем у парафіі пробашча.

Пухла Юзаф (Ахілес) — вікарый парафіі ў Гродна, пасля ў Івянцы і пробашч у Пяршаях. Нарадзіўся 18 сакавіка 1911 г. у мястэчку Косіна, каля Ланьцута. Уступіў у закон 21 верасня 1927 г., пасвечаны ў святары 5 снежня 1936 г.

Стэмпень Караль (Герман) — вікарый парафіі ў Івянцы і Вільні. Нарадзіўся 21 кастрычніка 1910 г. у Лодзі. Уступіў у закон 2 верасня 1928 г., пасвечаны ў святары 25 снежня 1937 г.

Сумленныя, міласэрныя, самаахвярныя маладыя ксяндзы заваявалі сярод пяршайскіх парафіян высокі аўтарытэт. Але мірнае існаванне людзей было парушана, бо пачалася вайна.

У час Вялікай Айчынай вайны вакол вескі Пяршаі пачалі дзейнічаць партызаны. Вялікія лясы Валожыншчыны сталі зручным месцам, дзе размясцілася кіраўніцтва партызанскага руху. Тут дзейнічалі брыгады імя Фрунзэ, імя Сталіна, імя Шчорса, «За Савецкую Беларусь», «Чкалаўская» і інш.

Першая партызанская група была арганізавана летам 1941 г. Гэта былі 15 чалавек, якія збіралі зброю і бояпрыпасы, пранікалі ў гарнізоны суперніка ў Радашковічах, Пяршаях, Валожыне, Ракаве і Маладзечна, прыносілі каштоўныя звесткі, вялі актыўную агітацыю сярод насельніцтва. Яе ўзначылі Міхаіл Грыбанаў, Дубанос і Сяргей Слесараў. У вёсцы Пранчэйкава на кватэры Антона Дымейкі адбываліся падпольныя сходы.

У Налібоцкай пушчы, а дакладней у яе пяршайскай частцы — Куры-грады, знаходзіліся абласная і раённая друкарні. Партызанскія злучэнні мелі ў пушчы два аэрадрома: зімні — на возеры Кромань, летні — у Печышчы. Там прымалі самалеты з Вялікай зямлі з медыкаментамі, літаратурай, боепрыпасамі і г.д. Мелася магчымасць накіроўваць у савецкі тыл старых і дзяцей.

У 1942 г. зона, якая прылягала да Пяршаяў, і ўсе пяршайскія лясы былі абвешчаны немцамі як небяспечныя. Дарога ад Пяршаяў да Івянца ахоўвалася акупантамі і летам і зімой. У саміх Пяршаях аккупанты былі вымушаны ўвесь час трымаць невялікі гарнізон, які ўкрываўся ў бліндажах і за мураванымі сценамі старога графскага дома. Днем немцы не наважваліся нават хадзіць па вуліцах сяла. Страх перад партызанамі прымусіў капаць траншэі праз вуліцы вёсцы. Траншэі былі глыбокія, у рост чалавека, і абнасіліся калючым дротам. Па гэтых траншэях немцы дабіраліся да ўправы і іншых устаноў. «Нямецкія тратуары» — так іранічна называлі гэтыя траншэі сяляне. На вежах касцела былі ўстаноўлены кулямёты. Але гарнізон усё роўна быў знішчаны партызанамі.

19 чэрвеня 1943 г. ў Івянцы выбухнула паўстанне супраць нацыстаў. Як рэакцыя на гэтыя здарэнні нацысты распачалі гвалтоўную пацыфікацыю навакольных вёсак. 15 ліпеня 1943 г. карныя атрады ўвайшлі ў Пяршаі з мэтаю спалення вёскі разам з жыхарамі. Атрымаўшы паведамленне ад каменданта паліцыі аб запланаванай пацыфікацыі, святары Ахілес і Герман адмовіліся ад уцёкаў, патлумачыўшы

гата тым, што павінны застацца разам з вернікамі, выказваючы словы: «Дзе авечы, там павінен быць і пастыр». На наступны дзень арыштаваныя былі перагнаныя ў вёску Баравікоўшчына каля Івянца. Па дарозе святары даведаліся, што яны загінуць, а рэшта арыштаваных застанецца жыць і будзе скіраваная ў лагеры. Увечары таго самага дня гэтыя браты-францішкане былі забітыя выстралам ў галаву. Іх целы былі спаленыя гітлераўцамі на ўскрайку вёскі Баравікоўшчына. Рэшткі іх недапаленых целаў былі адшуканыя парафіянамі і пахаваныя каля касцёла ў Пяршаях. Ад 23 верасня 2000 г. іх рэліквіі, даступныя для ўшанавання, знаходзяцца ў першайскім касцеле святога Юрыя.

На сённяшні дзень існуе шмат помнікаў гэтай трагедыі. Кожнае лета з Івянца і Пяршаяў ў Баравікоўшчыну адпраўляецца пілігрымка. Парафіяне збіраюцца і праходзяць пешшу шлях, які прайшлі айцец Ахілес і айцец Герман, а ўжо ў Баравікоўшчыне адбываецца імша за благаслаўлёных айцоў. Галоўная плошча вёскі Пяршаі носіць імя благаслаўленых Ахілеса і Германа. Каля касцёла і на месцы пакуты ксяндзоў стаяць інфармацыйныя стэнды, якія нагадваюць пра гэтую трагедыю.

### Крыніцы


1. *Шаўлоўская, Д.* Святыні не паміраюць / Д. Шаўлоўская. — Мінск : Рым.-Катал. парафія Св. Сымона і Св. Алены, 2011. — 136 с. : [41] іл.
2. Памяць: гісторыка-дакументальныя хронікі Валожынскага раёна / укл. Я.Я. Янушкевіч. — Мінск : Маст. літ., 1996. — 454 с.
3. *Ганчарык, М.М.* Мая Пяршайшчына / М.М. Ганчарык. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2004. — 197 с.



***Е.С. Кульман***
*Научный руководитель — И.И. Сацукевич*
*БГЭУ (Минск)*


## РОЛЬ ЛИ КУАН Ю В ЭКОНОМИЧЕСКОМ РАЗВИТИИ СИНГАПУРА

В 1965 г. Сингапур столкнулся с серьезными экономическими вызовами. В это время Ли Куан Ю стал ключевой фигурой, которая смогла преобразовать страну и реализовать ряд реформ, обеспечив ее экономический рост и развитие. В настоящей работе рассматриваются ключевые аспекты его деятельности и реформ, которые позволили Сингапуру занять лидирующие позиции в мировой экономике.

Актуальность темы исследования обусловлена тем, что реформы Ли Куан Ю являются важным источником и примером развития любой экономики. Изучение